*Л.Ч.ДРОЖЖА*

# ЭТАПЫ ВЫВУЧЭННЯ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЙ ПРАБЛЕМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ГіСТАРЫЯГРАФІІ (1930-2000)

Предлагается выделить современный третий этап в изучении западнобелорусской проблематики в связи с изменениями в методологии исторических исследований и утверждением национальной историографической концепции в начале 1990-х гг.

The author suggests distinguishing a modern third period of West Belarusian problems in the context of changes in the methodology of historical research and the foundation of the national historical and geographical conception at the beginning of the 1990s.

У савецкі перыяд заходнебеларуская праблематыка вывучалася як з беларускіх нацыянальных пазіцый, так і ў рэчышчы расійска-савецкай вялікадзяржаўнай канцэпцыі «адзінства савецкага народа». Дамінуючымі тэмамі даследаванняў у 1940-1980-я гг. з'яўляліся: вывучэнне дзейнасці КПЗБ (КПП, КПБ(б)) і яе кіруючай ролі ў нацыянальна-вызваленчым і дэмакратычным руху супраць «польскіх акупантаў», сацыяльна-культурныя пераўтварэнні і поспехі ў сацыялістычным будаўніцтве пасля аб'яднання анексіраваных Польшчай заходніх абласцей Беларусі ў адзіную Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку ў складзе СССР.

Напрыканцы 1939 г. і ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе расійскія і беларускія гісторыкі У.І. Пічэта, Ц.С. Гарбуноў, Н.В. Каменская, Г.А. Барадач, К.І. Дамарад, І.А. Юхо[1] акцэнтавалі ўвагу на барацьбе беларускага народа супраць «польскай экспансіі» і «прыгнёту паноў», а таксама «вызваленчым паходзе» Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 г., які ліквідаваў гістарычную несправядлівасць вынікаў Рыжскага дагавора 1921 г. і вырашыў спрадвечную мару беларускага народа аб уз'яднанні ў адзіную дзяржаву. У той жа час некаторыя даследчыкі адстойвалі станоўчы характар падзей верасня 1939 г. і для палякаў. У прыватнасці,

гісторыкі Г.А. Барадач і К.І. Дамарад сцвярджалі, што каля 1 млн палякаў знайшлі ў СССР паратунак ад фашысцкай акупацыі[2]. Адзначым, што гісторыкі-прапагандысты з марксісцкіх пазіцый даказвалі перавагу «савецкага ладу жыцця і дэманстравалі поспехі ў ажыццяўленні ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі»[3].

У другой палове 1950-х гг. пасля развянчання культу асобы Сталіна і рэабілітацыі палітвязняў гісторыкі атрымалі рэальную магчымасць пашырыць крыніцазнаўчую базу сваіх даследаванняў і зрабіць іх больш навуковымі. На пачатку 1960-х і ў 1970-я гг. тэматыка прац беларускіх навукоўцаў засталася аналагічнай, толькі былі зроблены некаторыя абагульненні і крыху змешчаны акцэнты. Гісторыкі І.М. Ігнаценка, В.С. Кабяк, У.Ф. Ладысеў, А.М. Мацко, У.М. Міхнюк, У.А. Палуян, І.У. Палуян, А.А. Сарокін, І.О. Царук і іншыя пераканаўча адлюстроўвалі поспехі сацыялістычных пераўтварэнняў у Заходняй Беларусі і міжнародны ўклад вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г. у справу калектыўнай бяспекі ад гітлераўскай агрэсіі[4]. Безумоўна, пазітыўныя змены ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі (надзяленне сялян зямлёй і «ліквідацыя кулацтва як класа»), дэмакратычныя выбары ў Народны Сход, стварэнне сістэмы народнай адукацыі і ліквідацыя малаграматнасці сярод мясцовага насельніцтва спрыялі працэсу ўсталявання Савецкай улады ў заходніх абласцях Беларусі. Але ж тэза аб «завяршэнні пераўтварэння беларускай нацыі ў сацыялістычную», дэкларавaная ў акадэмічным выданні пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР»[5], прывяла да змены палітыкі «паланізацыі» на «саветызацыю» і «русіфікацыю».

У 1970-1980-я гг. беларускія даследчыкі І.П. Хаўратовіч, У.Ф. Ладысеў, У.М. Міхнюк зрабілі першыя спробы перыядызацыі гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі[6]. І.П. Хаўратовіч атаясамлівае дадзеную праблему з вывучэннем этапаў станаўлення і дзейнасці КПЗБ. Ён прапануе вылучыць тры перыяды: першы - ад стварэння партыі ў 1923 г. і да яе роспуску ў 1938 г. - кароткі перыяд палітыкі «беларусізацыі» і пачатак усталявання марксізму-ленінізму ў гістарычных даследаваннях; другі - з 1938 па 1956 г., дзе мелі месца масавыя рэпрэсіі супраць навукоўцаў; трэці перыяд пачаўся з другой паловы 1950-х гг., пасля асуджэння культу асобы Сталіна XX з'ездам КПСС. Апошні перыяд звязаны з інтэнсіўным вывучэннем рэпрэсіраваных дзеячаў КПЗБ, БСРГ і іншых партый з вылучэннем шырокага кола архіўных крыніц.

У.М. Міхнюк у гістарыяграфічным аглядзе па праблемах сацыялістычных пераўтварэнняў у заходніх абласцях БССР толькі тэматычна падзяліў працы навукоўцаў па дзесяцігодках - ад 1940-х да 1970-х гг. Адзначым цікавы факт: упершыню ў беларускай гістарыяграфіі быў зроблены кароткі агляд «фальсіфікацыі буржуазнымі гісторыкамі» вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г. тэрыторый Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны перад пагрозай фашысцкай агрэсіі. Сусветная грамадскасць, на думку аўтара, успрыняла яго як «найважнейшы прагрэсіўны крок і паслядоўную праяву пралетарскага інтэрнацыяналізму»[7].

У.Ф. Ладысеў у сваёй доктарскай дысертацыі па праблемах арганізацыі барацьбы працоўных за дэмакратыю (1988) пад кіраўніцтвам КПЗБ пры гістарыяграфічным аглядзе літаратуры па Заходняй Беларусі выдзеліў два перыяды: першы - канец 1920-х - сярэдзіна 1950-х гг.; другі - з сярэдзіны 1950-х і да пачатку 1980-х гг. У гэтыя часы былі рэабілітаваны несправядліва абвінавачаныя ў апартуністычнай дзейнасці вядучыя дзеячы КПЗБ, БСРГ, КПЗУ, КПП і іншых грамадскіх аб'яднанняў. У сваю чаргу, даследчык прапануе ў першым перыядзе вылучыць два этапы: першы - з 1923 па 1938 г. - тэрмін дзейнасці КПЗБ і яе роспуску; другі - пасля роспуску партыі і да яе рэабілітацыі ў 1956 г.[8]

Такім чынам, асноўнымі вехамі ў гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі вучоныя савецкага перыяду называлі стварэнне КПЗБ, яе роспуск і рэабілітацыю. Гэта тлумачыцца дамінуючым становішчам гісторыка-партыйнай тэматыкі ў савецкія часы і, увогуле, дзейнасці КПЗБ пад кіраўніцтвам КПБ і КПП. І, нягледзячы на тое, што дадзеная праблематыка з'яўлялася вузлавой, неправамерна атаясамліваць перыядызацыю гістарыяграфіі КПЗБ з перыядызацыяй гістарыяграфіі Заходняй Беларусі з нагоды недасканалай крыніцазнаўчай базы і ідэалагічнай накіраванасці прац навукоўцаў.

У пачатку 2000 г. гісторыкі-неапазітывісты В.А. Астрога, А. Смалянчук, В.Ф. Кушнер , зыходзячы з адзначанага шырокага кола аспектаў, зрабілі чарговую спробу перыядызацыі гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921-1939 гг., за аснову якой яны ўзялі тыя ж прынцыпы, што і іх калегі ў ранейшыя гады. Напрыклад, В.А. Астрога скрупулёзна выдзяляе пяць перыядаў у вывучэнні савецкімі даследчыкамі дзейнасці КПЗБ, яе роспуску і рэабілітацыі (два перыяды - даваенныя і тры - пасляваенныя). В.Ф. Кушнер схематычна аналізуе дасягненні і недахопы савецкай гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі. Ён, безумоўна, мае рацыю, калі лічыць, што праблемы беларуска-польскіх і савецка-польскіх адносін у савецкія часы вывучаліся ў рэчышчы руска(савецка)-цэнтрычнай канцэпцыі, дзе польска-беларускім адносінам адводзілася фрагментарная роля. Да таго ж акцэнтаванне гісторыкаў на авангарднай ролі КПЗБ у нацыянальна-вызваленчым руху адсоўвала на другі план дзейнасць такіх грамадска-палітычных партый і грамадскіх арганізацый, як Беларуская сялянска-работніцкая грамада, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Таварыства беларускай школы, пасольскі клуб «Змаганне» і інш.[10]

Найбольш дасканалай з тэматычнага і метадалагічнага пунктаў гледжання з'яўляецца перыядызацыя гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі, прапанаваная гродзенскім гісторыкам А. Смалянчуком. Ён выдзяляе два савецкія перыяды: першы - канец 1930 - сярэдзіна 1950-х гг.; другі -другая палова 1950-х - канец 1980-х гг. і трэці - сучасны, пасля абвяшчэння суверэнітэту і незалежнасці Беларусі. На пачатку 1990-х гг., пасля зняцця сакрэтных грыфаў са шматлікіх архіўных матэрыялаў і адмены партыйнага кантролю з навуковых даследаванняў, у гісторыкаў з'явілася рэальная магчымасць для плённай працы над раней закрытымі тэмамі гісторыі перадваеннага часу і пераасэнсавання вядомых падзей. Гэта датычыцца факта сакрэтных пагадненняў паміж Гітлерам і Сталінам у жніўні 1939 г. аб размежаванні сфер інтарэсаў СССР і Германіі ў краінах Балтыі і Польшчы; масавых арыштах, рэпрэсіях і дэпартацыі сярод мясцовага насельніцтва, якое варожа ставілася да «таталітарнай палітыкі саветызацыі» і інш. Такім чынам, пачала стварацца беларуская нацыянальная гістарыяграфічная традыцыя.

Падсумоўваючы вопыт айчыннай гістарыяграфіі заходнебеларускага пытання, мы маем рацыю вызначыць тры перыяды ў развіцці беларускай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі. Першы -з канца 1920-х да 1956 г.; другі - з 1956 г. да канца 1980-х гг.; трэці, сучасны, пачаўся на пачатку 1990-х гг. Характэрна тое, што такая перыядызацыя гісторыі гістарычнай навукі Беларусі[11] ў прынцыпе супадае з агульнапрынятай.

На нашу думку, у першым перыядзе неабходна выдзеліць *два этапы. Першы этап* прыпадае на канец 1920-х - 1930-я гг., калі гістарычная навука цалкам залежала ад партыйна-ідэалагічнай накіраванасці. У гэты час у савецкім перыядычным друку разгортвалася агітацыйная прапаганда ў падтрымку партызанскага руху і стварэнню КПЗБ, якая ў сваю чаргу павінна была кіраваць рэвалюцыйна-вызваленчым рухам насельніцтва Заходняй Беларусі супраць прыгнёту польскіх паноў.

*Другі этап* прыпадае на 1930-я - першую палову 1950-х гг. Ён характарызуецца жорсткім партыйна-дзяржаўным дыктатам, шматлікімі палітычнымі рэпрэсіямі, у тым ліку і ў навуковым асяроддзі. Сур'ёзнай рэарганізацыі, чысткам, а потым і ліквідацыі ў 1938 г. падвергліся КПЗБ і КПП. Шмат навукоўцаў праходзілі па справе "Саюза вызвалення Беларусі" і "Беларускага нацыянальнага цэнтра", што негатыўна паўплывала на савецкую ідэалагічную машыну. Пасля вызваленчага паходу верасня 1939 г. пытанне авангарднай ролі КПЗБ у нацыянальна-вызваленчым руху ігнаравалася і звужалася да канстатацыі агульных прычын яго станаўлення і развіцця. У навуковых выданнях канца 1930-х - пачатку 1950-х гг. назіраўся схематызм і перабольшанне ролі рэвалюцыйнай актыўнасці мае у Заходняй Беларусі. Па-ранейшаму вельмі слабай заставалася крыніцазнаўчая база.

Другі перыяд-з 1956 і да канца 1980-х гг. - лічыцца самым пленным і даволі выніковым у развіцці гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі. У гэтыя гады былі падрыхтаваны і абаронены болей за дваццаць кандыдацкіх і пяць доктарскіх дысертацый па вузлавой заходнебеларускай праблеме - аван-

гарднай і куруючай ролі КПЗБ у рэвалюцыйным руху. Шмат увагі па-ранейшаму надавалася сацыяльна-эканамічнаму становішчу працоўных Заходняй Беларусі і палітыцы нацыянальнай асіміляцыі з боку польскага ўрада. На падставе гэтых дысертацыйных прац выдадзена больш двух дзесяткаў манаграфій, сотні навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у перыядычным друку і энцыклапедычных выданнях. Нягледзячы на панаванне ў савецкі перыяд марксісцка-ленінскай метадалогіі, у другой палове 1980-х гг. у навуковых даследаваннях назіраецца перагляд папярэдніх канцэпцый савецкай гісторыі на падставе плюралізму поглядаў, вывучэння раней закрытых тэм і крыніц. Але, як і раней, больш прац насіла навукова-прапагандысцкі характар, дзе аўтары амаль цалкам абапіраліся на пастановы партыйных органаў[12].

У пачатку 1990-х гг. пасля распаду савецкай дзяржавы і станаўлення незалежнай і суверэннай Беларусі ў гістарычнай навуцы з'явілася рэальная магчымасць эфектыўна выконваць свае грамадскія функцыі пазнавання мінулага і гістарычнай асветы (гнасеалагічнай і эпістыміялагічнай). На змену манаполіі марксізму-ленінізму і ідэалагічнаму дыктату КПСС - КПБ прыйшлі прынцыпы «гістарызму» і «пазітывізму» ў вывучэнні раней закрытых тэм, што спрыяла якасна новым зменам у гістарычнай навуцы.

Між тым савецкая гістарычная навука знаходзілася ў прамым падпарадкаванні «ўласным асобам», большасць з якіх былі перакананы ў тым, што яны маюць магчымасць падтасоўваць гістарычныя факты. Акрамя гэтага, гісторыя ведае шмат прыкладаў так званага «мяккага канфармізму», калі вучоныя прыстасоўваліся да афіцыйнай канцэпцыі. У выніку гэтага ўзнік тэрмін «афіцыйная гістарыяграфія».

Адзначаная тэндэнцыя ўвасобілася ў Беларусі, дзе разам з «афіцыйнай» існуе «нацыянальная» гістарыяграфія, прадстаўнікамі якой з'яўляюцца шмат акадэмічных і універсітэцкіх вучоных-гісторыкаў: М.П. Касцюк, У.І. Навіцкі, М.О. Біч, У.М. Міхнюк, У.Н. Сідарцоў, Г.М. Сагановіч, А.А. Краўцэвіч і інш. Дзякуючы іх намаганням, у канцы 1990-х гг. была распрацавана нацыянальная канцэпцыя гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Беларусі, вызначаны інстытуцыйныя і метадалагічныя парадыгмы ў беларускай гістарычнай навуцы, пазначаны пазітыўныя тэндэнцыі ў росце кадравага патэнцыялу вучоных-гісторыкаў у апошняе дзесяцігоддзе[13]. У 1999-2001 гг. Інстытутам гісторыі НАН Беларусі і Беларускім Гістарычным Таварыствам (Гродна) былі арганізаваны навуковыя канферэнцыі па актуальных пытаннях нацыянальнай гістарыяграфіі[14]. Аўтары дакладаў падкрэслівалі, што сярод гісторыкаў-прафесіяналаў адбылося падзяленне на «нацыяналістаў-неапазітывістаў» празаходняй арыентацыі і «патрыётаў-аб'ектывістаў», прыхільнікаў адзінства народаў Беларусі і Расіі. У беларускай гістарычнай навуцы наметціліся пазітыўныя тэндэнцыі кансалідацыі вучоных вакол нацыянальнай навуковай гістарыяграфічнай школы і паступовае вызваленне ад уплыву расійскіх навуковых цэнтраў Масквы і Санкт-Пецярбурга.

Не абмінула дадзеная тэндэнцыя і праблематыку даследаванняў гісторыі Заходняй Беларусі, якая значна пашырылася за кошт вывучэння раней закрытых тэм і архіўных матэрыялаў. Прадстаўнік «афіцыйнай» гістарыяграфічнай традыцыі В.Ф. Кушнер умоўным рубяжом павароту да асвятлення гісторыі Заходняй Беларусі з новых метадалагічных пазіцый лічыць 1993-1994 гг., калі былі надрукаваны артыкулы прафесараў У.Ф. Ладысева і А.Ф. Хацкевіча[15], у якіх разглядаліся праблемы арыштаў і дэпартацый у заходніх абласцях Беларусі ў 1939-1941 гг.

Гродзенскі гісторык Аляксандр Смалянчук сучасным навуковым «прарывам» лічыць перавыданне кнігі замежных беларускіх даследчыкаў Я. Найдзюка і І. Касяка «Беларусь учора і сяньня» (Мн., 1993), дзе беларускі чытач упершыню атрымаў магчымасць пазнаёміцца з несавецкай канцэпцыяй падзей 23 жніўня і 17 верасня 1939 г. аб падзеле сфер уплываў паміж СССР і Германіяй у лёсе Польшчы. У апошняе дзесяцігоддзе прадстаўнікі сярэдняга і малодшага пакалення беларускіх навукоўцаў (В.А. Белазаровіч, А.М. Вабішчэвіч, А.А. Каваленя, У.Ф. Ладысеў, Р.Р. Лазько, А.М. Літвін, А.А. Савіч, У.Е. Снапкоўскі, М.Б. Сямёнчык, Н.Л. Улейчык, А.В. Ціхамораў[16] і інш.) прыступілі да пераадолення недахо-

паў і стэрэатыпаў савецкай гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі. Яны з пазіцый «гістарызму» і «пазітывізму» прааналізавалі вынікі Рыжскага дагавору ў лёсе народаў Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны; палітыкі «паланізацыі і асіміляцыі ўсходніх крэсаў» II Рэчы Паспалітай; вынікі пакта Рыбентропа-Молатава 23 жніўня 1939 г. у падзеле Польшчы паміж Гітлерам і Сталінам і пачатку Другой сусветнай вайны; дзейнасць Арміі Краёвай на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1939-1941 гг.[17] Замежнымі даследчыкамі і некаторымі беларускімі неапазітывістамі празаходняй арыентацыі сацыялістычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях Беларусі пасля далучэння да БССР трактуюцца як таталітарная палітыка саветызацыі. Значнай яе часткай былі арышты і дэпартацыі мясцовага насельніцтва па нацыянальнай і рэлігійнай прыналежнасці, рэпрэсіі ў адносінах да палітычных лідэраў КПЗБ, КПП і іншых грамадскіх дзеячаў. Прыхільнікі «нацыяналынай» гістарыяграфічнай традыцыі разам з тым лічаць, што нельга ігнараваць станоўчыя вынікі гістарычнага аб'яднання беларускага народа ў адзіную суверэнную дзяржаву БССР і яе гвалтоўнага падзелу пасля Рыжскага дагавору 1921 г. Такім чынам, на пачатку 1990-х гг. правамерна вылучыць трэці, сучасны перыяд вывучэння заходнебеларускай праблематыкі ў беларускай гістарыяграфіі.

Аўтар выказвае шчырую падзяку доктару гістарычных навук, прафесару У.Е. Снапкоўскаму за дапамогу ў падрыхтоўцы дадзенага артыкула.

1 Гл.: Пичета В.И. Исторические судьбы Западной Украины и Западной Белоруссии. М., 1939; Гарбуноў Ц.С. Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве. Мн., 1949; Каменская Н.В. Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Беларускай савецкай сацыялістычнай дзяржаве. Мн., 1948; Бородач Г.А. Коммунисты Белоруссии в борьбе за социалистическое переустройство сельского хозяйства западных областей БССР. 1939-1950. Мн., 1953; Барадач Г.А., Дамарад К.І. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР. Мн., 1959; Юхо И.А. Установление Советской власти в Западной Белоруссии в 1939 г. Мн., 1954.

2 Гл.: Барадач Г.А., Дамарад К. І. Там жа. С. 26.

3 Каменская Н.В. Указ. сач. С. 7-12.

4 Гл.: Игнатенко И.М., Мацко А.Н. Дорогой борьбы и созидания. Мн., 1979; Кобяк В.С. Под знаменем пролетарской солидарности. Мн., 1979; Ладысеў У.Ф. Шлях да свабоды. З гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919-1939 гг. Мн., 1978; Мацко А.Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Беларуси против гнета буржуазии и помещиков, 1918-1939 гг. Мн., 1972; Михнюк В.Н. Социалистические преобразования в Западных областях БССР (сентябрь 1939 - июнь 1941 гг.). Историографический очерк. Мн., 1979; Полуян В.А., Полуян И.В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг. Мн., 1962; Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Беларуси (1927-1939 гг.). Мн., 1978; Сорокин А.А. Освободительное и революционное крестьянское движение в Западной Белоруссии. Мн., 1970; Царюк И.О. Деятельность КПБ по осуществлению социалистических преобразований и организации социалистического строительства в западных областях Белоруссии (сентябрь 1939 - июнь 1941 гг.): Автореф. дис. ... д-ра ист. наук. Мн., 1975; Царюк И.О. В братском союзе. Мн., 1976.

5 Гл.: Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Мн„ 1975. Т. 4. С. 114.

6 Гл.: Ховратович И.П. Историография КПЗБ и революционного движения в Западной Белоруссии // В авангарде революционной борьбы. Мн., 1974; Михнюк В.Н. Социалистические преобразования в Западных областях БССР (сентябрь 1939 - июнь 1941 гг.). Историографический очерк. Мн., 1979; Ладысев В.Ф. Деятельность Компартии Западной Белоруссии по организации трудящихся масс на борьбу за демократию, подведение их к социалистической революции: Автореф. дис. ... д-ра ист. наук. Мн., 1988.

7 Гл.: Михнюк В.Н. Там жа. С. 7.

8 Гл.: Ладысев В.Ф. Указ. сач. С. 4-7.

9 Гл.: Астрога В.А. Палітычныя і нацыянальна-культурныя праблемы Заходняй Беларусі 1939-1941 гг. у гістарыяграфіі БССР (1939-1941 гг.) // Bialoruskie Zeszyty Hisloryczne. Biatystok, 2000. Nr 13. S. 158-170; Смалянчук А. Верасень 1939 г. у савецкай і беларускай гістарыяграфіі // Пстарычны альманах. 2000. Т. 3. С. 77-89; Кушнер В.Ф. Асвятленне гісторыі Заходняй Беларусі 1921-1941 гадоў у сучаснай беларускай гістарыяграфіі // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. Biatystok, 2000. Nr 13. S. 144-157.

10 Гл.: Кушнер В.Ф. Тамжа. S. 144-145.

11 Гл.: Петрыкаў П.Ц. Перыядызацыя гісторыі гістарычнай навукі ў БССР // Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. 1990. № 6. С. 52-65.

12 Гл.: Ладысев В.Ф. В борьбе за демократические права и свободы. Мн., 1988; Зелинский П.И. Политическая работа КПЗБ в массах. 1923-1938. Мн., 1986; Полуян И.В. Западная Беларусь в период экономического кризиса 1929-1933 гг. Мн., 1991; 50 лет воссоединения Западной Беларуси с Белорусской ССР в составе Союза Советских Социалистических Республик // Материалы науч.-практ. конф. Гродно, 1989.

13 Гл.: Біч М. О. Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 1. С. 15-24; Сагановіч Г.М. Дзесяць гадоў беларускай гістарыяграфіі / Беларускі гістарычны агляд. Т. 8, сш. 1/2 (2001). С. 215-229; Краўцэвіч А. А. Праблемы гістарычнай навукі на Беларусі // Пстарычны альманах. 2001. Т. 4. С. 6-13; Сидорцов В.Н. Методология исторического исследования. Механизм творчества историка. Мн., 2000.

[14]Гл.: ГІтарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця // Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Мінск, 6-7 кастрычніка 1999 г.). Мн., 2000; Problemy historiografii ojczystej, 19-21 stycznia, 2001, Grodno // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. Biatystok. 2001. Nr 15. S. 255-257.

[15]Гл.: Кушнер В.Ф. Там жа. S. 144-157; Ладысеў У. Ф. Цяжкі шлях выпрабаванняў // Беларуси гістарычны часопіс, 1994. № 1. С. 81-88; Хацкевіч А.Ф. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939-1941 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1. С 89-94; № 2. С. 70-76.

[16]Гл.: Белозорович В.А. Аграрные преобразования в Западных областях Беларуси. 1939-1952 гг.: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1999; Вабішчэвіч А.М. Праблемы нацыянальна-культурнага жыцця заходніх абласцей БССР у 1939-1941 гг. // Biatoruskie Zeszyty Historyczne. Biatystok, 2000. Nr 13. S. 118-130; Каваленя А.А. Беларусь у гады другой сусветнай вайны (1939-1945). Мн., 1996; Ладысеў У.Ф. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917-1939 гг.). Мн., 2003; Лазько Р.Р. Перад патопам: Еўрапейская палітыка Польшчы (1932-1939 гг.). Мн., 2000; Літвін А.М. Армія Краёва на Беларусі: да праблемы вывучэння // Беларускі гістарычны часопіс. 1994. № 1. С. 65-73; Савіч А.А. Рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 1921-1939 гг.: гістарыяграфія праблемы: Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук. Мн., 2002; Снапкоўскі У.Е. Беларусь у геапалітыцы і дыпламатыі перыяду Другой сусветнай вайны і пачаткухалоднай вайны (1939-1947 гг.)// Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе. Мн., 2002. С. 80-92; Сямёнчык М.Б. Пытанні рабочага руху ў Заходняй Беларусі 1921-1939 гг. у польскай гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. С. 15-17; Тихомиров А.В. Проблемы определения восточной границы Польши в 1920 - начале 1921 г. // Белорусский журнал международного права и международных отношений. 2004. № 2. С. 49-61; Улейчык Н.Л. Фарміраванне савецкай інтэлігенцыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939-1950 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1999. № 3. С. 12-14.

[17] Гл.: Назаўсёды разам: да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Мн., 1999; Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць. Мн., 2000; Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і лесы народаў Усходняй Еўропы. Мн., 2001; XX стагоддзе ў п'сторыі палякаў і беларусаў. Мн., 2001; Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе. Мн., 2002; Юзаф Пілсудскі ў гісторыі Польшчы і Беларусі. Мн., 2002.

Паступіў у рэдакцыю 24.02.05.

***Людміла Чэславаўна Дрожжа*** - навуковы супрацоўнік Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі.